*МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ*

220004, г.Мінск, пр.Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

27.07.2017 № 11-01-01/8

Ашмянскі раённы выканаўчы камітэт

**4. Аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці элементу нематэрыяльнай культурнай спадчыны "Традыцыя шанавання валуна "Нявесцін камень" у Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці.**

Заслухаўшы інфармацыю метадыста ДУК "Ашмянскі раённы цэнтр культуры" Жыліка С.А. аб традыцыі шанавання валуна "Нявесцін камень", якая бытуе ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці, ВЫРАШЫЛІ:

4.1. Адзначыць адпаведнасць прапанаванай для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці традыцыі паняццю нематэрыяльнай культурнай спадчыны, дадзенаму пунктам 1 артыкула 2 Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 г., і крытэрыям для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, вызначаным і Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры.

4.2. Прыняць да ўвагі, што традыцыя шанавання валуна "Нявесцін камень" з'яўляецца жывой практыкай перадачы ведаў, звязаных з сучасным выражэннем даўніх традыцый.

4.3. Пагадзіцца з неабходнасцю надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыі "А" нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека - "Традыцыя шанавання валуна "Нявесцін камень" у Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці.

Намеснік Міністра,
Старшыня навукова-
метадычнай рады _______________ А.А.Яцко

11 Ходар 209 43 87